**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2019 г.

## Мерапрыемствы да Вялікодных свят

**26 красавіка**

У бібліятэцы прайшоў майстар-клас «Светлое Восресенье» па стварэнні велікоднага сувеніра. Удзельнікі пазнаёміліся з гісторыяй свята, яго традыцыямі, адказвалі на пытанні віктарыны. Дзеці аздаблялі яйкі, рыхтавалі сувеніры і вырабы, малявалі. Бібліятэкар навучыла дзяцей працаваць у тэхніцы дэкупажу, скарыстаючы пры гэтым даступныя матэрыялы: акрылавыя фарбы, сурвэткі і клей ПВА. Як вынік творчасці дзяцей у бібліятэцы арганізавана выстава малюнкаў «Сустракаем Вялікдзень» і выстава вырабаў «Велікоднае дзіва».

Батчынская ПБ, 32 чал

**28 красавіка**

ЛПГ «Натхненне» правяла тэматычны вечар «Пусть поёт пасхальный звон нам о жизни вечной!». Вядучыя распавялі гасцям пра сэнс і традыцыі святаў Вербная нядзеля і Вялікдзень, патлумачылі сэнс асвячэння велікодных яек і кулічоў, прачыталі вершы, прысвечаныя Вялікдню. Дзеці нядзельнай школы царквы Ушэсця Гасподняга аг. Гарадзец і вакальнага гуртка клуба выканалі святочныя спевы і паказалі інсцэніроўку «Вянок для Хрыста».

Гарадзецкі філіял, 60 чал.

**28 красавіка**

У час правядзення пасяджэння клуба сямейнага чытання «Вечной Пасхи живительный свет» супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі прысутных з велікоднымі традыцыямі і звычаямі розных краін свету, падзяліліся ўспамінамі святкавання Вялікдня ў аграгарадку. Расказ вядучых суправаджаўся паказам мультымедыйнай прэзентацыі «Из глубины традиций». Прысутныя ўдзельнічалі ў разнастайных конкурсах, віктарынах, тэматычных гульнях. Закончылася мерапрыемства конкурсам святочных страў.

Дзівінскі філіял, 46 чал.

**28 красавіка**

На свяце «Велікодная радасць» з віншавальным словам перад прысутнымі выступіў протаіерэй Сергій, клірык Свята-Петрапаўлаўскай царквы г. Кобрына. Прадоўжылася праграма тэатралізаваным выступленнем дзіцячага клуба «Крынічка» «Велікодная радасць», святочным канцэртам, мультымедыйнай прэзентацый «Светлый праздник Пасхи». Прысутныя пазнаёміліся з выставай народнай творчасці «Рук залатых зямныя цуды» і кніжнай выставай «Пасхальны перазвон».

Залеская ПБ, 150 чал.

## **Мерапрыемствы да Сусветнага Дня здароў'я**

**10 красавіка**

Супрацоўнікі бібліятэкі правялі дыялог аб здароўі «Пять слагаемых здоровья» для падапечных дзённага знаходжання Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Яны расказалі аб правілах асабістай гігіены, захаванні рэжыму дня, рацыянальным харчаванні, фізічнай актыўнасці, аб згубным уздзеянні шкодных звычак. Напрыканцы мерапрыемства праведзена віктарына, паказаны мультфільм «Мойдодыр».

ЦБ, 23 чал.

**13 красавіка**

На ўрок здароўя «Я здароўе берагу – сам сабе дапамагу» сабраліся навучэнцы сярэдніх і старэйшых класаў Шамятоўскай СШ. Увазе прысутных прадстаўлена кніжная выстава «Сбереги себя для жизни», прапанаваны спіс выданняў па здароваму ладу жыцця, праведзены конкурсы «Собери пословицу и объясни её значение», «Глаза – зеркало души», «В здоровом теле – здоровый дух», «Сценический», «Ослепительная улыбка», «Загадки», «Здоровье», «Приятного аппетита», «Пословицы и поговорки о здоровье», гульня «Это я, это я, это все мои друзья» і інш. У заканчэнні мерапрыемства рабяты прагледзелі відэапрэзентацыю «Новое поколение за здоровое продвижение».

Шамятоўская ПБ, 26 чал.

**23 красавіка**

На пасяджэнні аматарскага клуба «Светач», уроку здароўя «Да - здоровью, да - мечте, нет - наркотикам, беде!» вучні школ горада даведаліся пра паходжанне сусветнага Дня здароў'я, пра метады і спосабы прафілактыкі ВІЧ/СНІДу, пра звычкі, якія наносяць непапраўную шкоду арганізму чалавека. Працягам мерапрыемства сталі рухомыя гульні і эстафеты.

Дзіцячы філіял, 31 чал.

## **Іншыя мерапрыемствы**

**2 красавіка**

Гасцямі літаратурна-тэматычнага вечара «Дружба народаў - дружба літаратур», прысвечанага Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, сталі прадстаўнікі Кобрынскага райвыканкама і навучэнцы ўстаноў адукацыі горада. Са словамі прывітання да прысутных звярнуўся старшыня раённага Савета дэпутатаў Іван Даўжук. Вядучыя расказалі аб гістарычных каранях свята, пазнаёмілі з творчасцю паэтаў Беларусі і Расіі, гісторыяй літаратурнага супрацоўніцтва двух народаў. Добрым дадаткам літаратурнай тэмы стаў відэаролік «Дзве Русі - дзве сястры». Гучалі песні ў выкананні Марыі Лемяшэўскай і Вікторыі Лукашук.

*Кобрынскі веснік. – 2019. – 6 красавіка. – С. 9.*

ЦБ, 98 чал.

**10 красавіка**

Пасяджэнне гісторыка-краязнаўчай секцыі клуба «Университета золотого возраста» прайшло ў рамках праекта «Хобі-цэнтр 55 +» у форме гульні «Што? Дзе? Калі?». У гульні ўдзельнічалі каманды «Непоседы», «Эрудиты», «Умка». Перамаглі гульцы каманды «Эрудиты». Арганізатарамі гульні выступілі члены каманды клуба «Старики-разбойники».

ЦБ, 31 чал.

**12 красавіка**

Творчая лабараторыя работнікаў публічных бібліятэк прайшла пад назвай «Марафон библиотечных проектов и идей: традиции и новации в массовой работе с детьми в рамках Недели детской и юношеской книги». Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі прааналізавала вынікі работы ГУК за 1 квартал 2019 года. Галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу зрабіла кароткі аналіз праведзеных мерапрыемстваў у рамках Тыдня публічнымі бібліятэкамі «Продвижение чтения: сохраняем традиции, ищем новое». Скончылася мерапрыемства кірмашом ідэй «Инновационные формы работы в продвижении детской и юношеской книги», на якім адбыўся абмен вопытам работы ў рамках правядзення Тыдня.

ЦБ, 56 чал.

**26 красавіка**

Гасцямі пасяджэння аматарскага моладзевага клуба «Час і ты» «Чернобыля черный апрель» сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Супрацоўнікі бібліятэкі нагадалі хроніку падзей, прычыны, якія прывялі да трагедыі, лічбы наступстваў катастрофы. Расказалі пра подзвіг пажарных, шахцёраў, аб працы ліквідатараў аварыі. Прысутныя прагледзелі відэапрэзентацыю «Черный дым Чернобыля над краем».

ЦБ, 52 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81